**24.** У якіх словах напісаны змякчальны мяккі знак?

*1) пяцьсот; 2) ледзьве; 3) льецца; 4) калье.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**25.** Выберыце правільна ўтвораныя словазлучэнні.

*1) пайсці па білеты; 2) загадчык кабінетам; 3) дзякаваць настаўніку.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** няма патрэбных словазлучэнняў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**26.** Дадзены сказы:

*1. Восень агаліла ўсе дрэвы, і ўсе кусты.*

*2. На ўсходзе непрыкметна зніклі ўсе зоркі, і чырвань пафарбавала небасхіл.*

*3. Лёгкае павуціннe лётала ў паветры і чаплялася за траву, і галлё.*

У якіх сказах няправільна пастаўлены знакі прыпынку?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**27.** Выберыце з прапанаваных сказы, у якіх ёсць сінтаксічна несвабодныя словазлучэнні.

*1. Насустрач нам выйшла прыгажуня з чорнымі вачыма.*

*2. Рэдка сонца з месяцам страчаюцца.*

*3. Зіхаціць люстра вады над небакраем.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**28.** Аўтарам паэмы “Тарас на Парнасе” з’яўляецца Канстанцін Вераніцын. Якое сапраўднае прозвішча паэта?

**А)** Іваноў. **Б)** Васільеў. **В)** Міцкевіч. **Г)** Юркевіч. **Д)** Мельнікаў.

---

**29.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі У. Караткевіча:

*З гарадоў егіпецкіх пажоўклых*
*Мо таму ўжо некалькі вякоў*
*Гандляры ў пахучых скрутках шоўку*
*Ў Беларусь завезлі* ***цвыркуноў****.*

Які адпаведнік мае выдзеленае слова ў рускай мове?

**А)** кузнечиков. **Б)** лошадей. **В)** сверчков. **Г)** шелкопрядов. **Д)** гусениц.

---

**30.** У свой час вядомы класік беларускай літаратуры напісаў: “*Навошта каласы, калі няма васількоў?*” Гэта быў … .

**А)** Францішак Багушэвіч. **Б)** Ядвігін Ш. **В)** Змітрок Бядуля.
**Г)** Максім Багдановіч. **Д)** Янка Купала.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
КОНКУРС
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 19. Тыраж 6700 экз. Мінск. 2024 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2024»

*Чацвер, 22 лютага 2024 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Колькі прыметнікаў у народным выслоўі?

*Сэрца маці лягчэйшае за пух і цвярдзейшае за камень.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**2.** Якое слова прапушчана ў народным выслоўі?

*Корань навукі горкі, ды плады яго … .*

**А)** кіслыя. **Б)** салодкія. **В)** горкія. **Г)** недаспелыя. **Д)** познія.

---

**3.** Вызначце, якое(-ія) слова(-ы) з прапанаваных не з’яўляецца(-юцца) лічэбнікам(-і).

*1) паўтара; 2) дзявяты; 3) адзінка.*

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**4.** Чым з’яўляецца выдзеленае спалучэнне слоў у радках Янкі Сіпакова?

*Прабачце,* ***даўнія стагоддзі****,*
*Што патрывожыў я ваш пыл…*

**А)** прыдаткам. **Б)** дададзенай часткай. **В)** выклічнікам.
**Г)** зваротам. **Д)** пабочным словазлучэннем.

**5.** Якія словы з прапанаваных напісаны правільна?

*1) мальберд; 2) прэстыж; 3) рымарка; 4) рэліквія.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**6.** Якія назвы дзён тыдня напісаны няправільна?

*1) недзеля; 2) чацверг; 3) среда; 4) суббота.*

**А)** усе назвы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**7.** Дадзены сказы:

*1. Без хлеба няма абед.., без капусты жываты пусты.*

*2. Дзядуля за дзень змайстраваў стол з дуб.. .*

*3. Якраз у канцы сад.. і знайшлі кош з яблыкамі.*

Выберыце сказы, у якіх на месцы пропуску ў словах напішаце літару ***у***.

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**8.** Як правільна напісаць форму зборнага лічэбніка ***абое*** ў творным склоне?

**А)** няма такой формы. **Б)** абаіх. **В)** абаімі. **Г)** аб абаіх. **Д)** абаім.

---

**9.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні: *1) як кот на сала; 2) кату па пяту; 3) чорны кот прабег; 4) купіць ката ў мяшку; 5) як кот наплакаў.*

Якому спалучэнню адпавядае лексічнае значэнне ‘*набыць што-небудзь, не ведаючы яго якасці*’?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**10.** Выберыце правільна напісаныя словы.

*1) перш-на-перш; 2) як-небудзь; 3) уручную; 4) па вольна.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**11.** Якое імя было ў галоўнага героя трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”?

**А)** Аляксей. **Б)** Андрэй. **В)** Сцяпан. **Г)** Іван. **Д)** Міхал.

---

**12.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы.

*1) баластны; 2) людскі; 3) фарпостны; 4) лідскі.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

---

**13.** Дадзены словазлучэнні:

*1) печаная бульба; 2) рыхтавацца старанна;*

*3) надзвычай цёпла; 4) другі дзень.*

Якое словазлучэнне абазначае прымету і яе ступень?

**А)** няма патрэбнага словазлучэння. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**14.** Якія прыклады з прапанаваных напісаны няправільна?

*1) Дзвіна-рака; 2) грыб падасінавік; 3) волат дуб.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**15.** Выберыце сказ, у якім правільна падкрэслены дзейнік.

*1. Белавежская <u>пушча</u> знаходзіцца недалёка ад Брэста.*

*2. Падзяліць <u>два</u> на дзесяць.*

*3. Прыйшло і <u>паслязаўтра</u>.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**16.** Дадзены словазлучэнні:

*1) развîты сказ; 2) развîтая культура; 3) развîты чалавек.*

У якім прыкладзе ў прыметніку правільна пастаўлены націск?

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма патрэбнага прыклада. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**17.** Агароджа з бярвёнаў, штыкецін або мураваная называецца … .

**А)** паркаль. **Б)** паркан. **В)** парнік. **Г)** парог. **Д)** паркет.

---

**18.** Дадзены словазлучэнні:

*1) разумець зпаўслова; 2) есці ўахвоту;*

*3) бачыцца штотыдзень; 4) ісці паасобку.*

Якія прыклады напісаны правільна?

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**19.** Выберыце з прапанаваных прыкладаў назоўнікі, якія ў форме меснага склону маюць канчатак ***-у(-ю)***.

*1) мост; 2) фестываль; 3) вучань;*

*4) урач; 5) бераг.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

---

**20.** Якія словы з дадзеных правільна падзелены для пераносу?

*1) ад-зна-чыць; 2) урад-жай; 3) заў-тра; 4) пра-ўнук.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**21.** Які знак прыпынку прапушчаны ў сказе з простай мовай?

“*Багдановіч быў асобай легендарнай высакароднасці, чалавекам рэдкай душэўнай далікатнасці і прыроднай інтэлігентнасці, пісаў Ніл Гілевіч, – чалавекам з неймаверна развітым пачуццём маральнага абавязку і асабістай годнасці.*”

**А)** кропка. **Б)** коска. **В)** працяжнік. **Г)** двукоссе. **Д)** двукроп’е.

---

**22.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы.

*1) у боцы; 2) дасвечанасць; 3) справавоцтва.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**23.** Дадзены словы:

*1) кр..шыць; 2) бр..во; 3) р..льеф.*

У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару **ы**?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.